# ШТО ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПОСПЕХ

## УМОВЫ ЎВАСАБЛЕННЯ ПРАГРАМЫ «ПРАЛЕСКА» Ў ПЕДАГАГІЧНУЮ ПРАКТЫКУ

### Сацыяльна-псіхалагічныя ўмовы

ВАЖНАЙ УМОВАЙ рэалізацыі праграмы з'яўляецца стварэнне спрыяльнага псіхалагічнага клімату як у кожнай групе, так і ў самой дашкольнай установе цалкам.

Псіхалагічны клімат вызначаецца эмацыянальна-псіхалагічным настроем групы, пераважаючым настроем усіх яе членаў, характарам і асаблівасцямі зносін, якія абумоўлены маральна-этычнымі нормамі. Ад псіхалагічнага клімату ў значнай ступені залежыць эмацыянальнае самаадчуванне асобы (унутраны спакой, пачуццё абароненасці, упэўненасці ў сабе і інш.), яе «Я-канцэпцыя», узровень дамаганняў, пачуццё самакаштоўнасці, прадуктыўнасць дзейнасці. Раскрыццё індывідуальнасці дзіцяці, яго здольнасцей, рэалізацыя творчых магчымасцей, развіццё матыва-цыі ў дасягненні поспехаў на працягу ўсяго жыцця вызначаюцца тым, наколькі цёплай, «хатняй», эмацыянальна камфортнай з'яўлялася атмасфера ў дзіцячым калектыве.

Галоўная роля ў стварэнні такой атмасферы належыць выхавальніку, яго асобе. Нездарма вялікі педагог К.Дз.Ушынскі адзначыў, што выхаваўчая сіла чэрпаецца толькі з жывой крыніцы чалавечай асобы, і ніякія статуты і праграмы, ніякі штучны арганізм установы, як бы хітра ён ні быў прадуманы, не можа замяніць асобу ў справе выхавання.

Выхавальнік уплывае на псіхалагічны клімат «дзіцячага грамадства» як непасрэдна (рэалізуючы ў прафесійным узаемадзеянні з дзецьмі сваю педагагічную пазіцыю, свае адносіны да выхаванцаў), так і апасродкавана (шляхам рэгулявання ўзаемаадносін паміж дашкольнікамі ў групе).

Асноўнае значэнне мае гуманістычны падыход педагога да выхавання і навучання дашкольнікаў, які прадугледжвае яго арыентацыю на асобу дзіцяці, адносіны да выхаванца як да найвялікшай каштоўнасці, прызнанне яго асабістай актыўнасці, добразычлівасці і вера ў дзяцей, актыўна-станоўчыя адносіны да іх, гатоўнасць зразумець і прыняць кожнага выхаванца, праявіць сімпатыю, суперажыванне...

Поспех у выхаванні і стварэнні спрыяльнага псіхалагічнага клімату залежыць ад паводзін і зносін педагога. Ён прыходзіць да таго, хто выкарыстоўвае дэмакратычны стыль кіравання, індывідуальны падыход да кожнага дзіцяці, хто шмат увагі надае гульні, казцы, музыцы, іншым мастацкім сродкам зносін з выхаванцамі, хто ўступае з дзецьмі ў супрацоўніцтва і сутворчасць.

Спрыяльны псіхалагічны клімат — гэта эмацыянальны тонус жыцця дзіцячай групы. Значная роля ў яго стварэнні належыць святам, ранішнікам у дзіцячым садзе (розныя віды лялечнага тэатра, сустрэчы з героямі любімых кніг, дні нараджэння, музычныя вечарыны, цыркавыя паказы, спартландыі і да т.п.). Удзел у іх не толькі павышае агульны тонус дзіцячага жыцця, нараджае радасны, вясёлы настрой, эмацыянальную прыўзнятасць, а і дае магчымасць дзіцяці перажыць хвіліны шчасця, эстэтычнай асалоды, суперажывання і згуртаванасці з усімі, хто акружае, — раўнагодкамі, дарослымі. Асабліва такія падзеі хвалююць дзяцей, калі ўдзел у іх бяруць бацькі. Праяўленне дарослымі ў зносінах з дашкольнікамі гумару, аптымізму, мажорнасці і, разам з тым, — увагі і зацікаўленасці ў кожным дзіцяці пазітыўна адбіваецца на «надвор'і» ў дзіцячай групе і дапамагае малышу перажыць часовыя цяжкасці, няўдачы, зберагчы веру ў сябе.

АТМАСФЕРА ў дзіцячай групе знаходзіцца ў цеснай узаемасувязі з псіхалагічным кліматам у педагагічным калектыве дзіцячага сада. Ад таго, як складваюцца міжасобасныя і дзелавыя зносіны паміж педагогамі (выхавальнікамі і іх памочнікамі, педагогамі і бацькамі), залежыць поспех і эфектыўнасць сумеснай дзейнасці ўсяго педагагічнага калектыву дашкольнай установы.

Атмасфера дашкольнай установы павінна спрыяць прафесійнаму і асабістаму творчаму росту выхавальнікаў, ствараць магчымасць для іх самавыяўлення, пазітыўна ўплываць на задаволенасць педагогамі сваёй працай.

Характэрнымі рысамі калектыву са спрыяльным сацыяльна-псіхалагічным кліматам з'яўляюцца: высокая згуртаванасць; адзінства і ўзаемнасць псіхалагічных сувязей, якія ўтрымліваюць членаў калектыву разам; спаянасць, імкненне працаваць сумесна; творчая атмасфера, давер і патрабавальнасць адзін да аднаго; добразычлівая і дзелавая крытыка; прыняцце педагогам на сябе адказнасці за стан спраў у дзіцячым садзе; задаволенасць прыналежнасцю да дадзенага калектыву. Важным фактарам з'яўляецца псіхолага-педагагічная сумяшчальнасць і спрацаванасць усіх яго членаў.

Сацыяльна-псіхалагічны клімат педкалектыву вызначаецца і ствараецца кожным яго супрацоўнікам. Асаблівая роля ў гэтым належыць кіраўніку дзіцячага сада. Яго высокі прафесіяналізм, цікавасць да педагагічных інавацый, калегіяльны стыль кіравання, ініцыятыўнасць, імкненне шукаць станоўчыя якасці ў людзях, добразычлівасць і тактоўнасць, уменне знаходзіць найлепшае практычнае прымяненне здольнасцям кожнага, забяспечваць з'яднанне членаў калектыву, рэгуляваць узаемаадносіны ў ім — гэта важныя ўмовы стварэння ў дзіцячым садзе творчай атмасферы, спрыяльнага сацыяльна-псіхалагічнага клімату.

Паспяховае ўвасабленне праграмы, яе інавацыйных гуманістычных ідэй у педагагічную практыку прадугледжвае працу педагога над сабой — прафесійнае самаўдасканаленне. Тое, на чым спыніцца выхавальнік, музычны кіраўнік, кіраўнік фізічнага выхавання, настаўнік-дэфектолаг дзіцячага сада, яго загадчык у працэсе самаадукацыі, ў многім залежыць ад інтарэсаў, спецыфікі выконваемых функцыянальных абавязкаў, ад тых цяжкасцей, якія прыходзіцца пераадольваць, ад прафесійнай падрыхтоўкі, вопыту кожнага. Гэта асобасна абумоўленая дзейнасць.



Аднак, трэба мець на ўвазе вызначаную навукоўцамі заканамернасць: прафесійны рост педагога, яго творчасць цесна звязаныя з тым, наколькі актыўна ў працэсе самаадукацыі ён далучаецца да агульнай і прафесійнай псіхалагічнай культуры, як задавальняе сваю патрэбнасць ў псіхалагічных ведах, уменнях, наколькі развітыя гэтыя патрэбнасці — акумулятары творчага патэнцыялу педагога. Актыўнаму педагогу патрэбны пастаянны духоўны рост.

## Прадметна-прасторавае асяроддзе

ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ педагагічнага працэсу ў значнай ступені залежыць і ад правільнай, разумнай арганізацыі прадметна-прасторавага асяроддзя дашкольнікаў. Важна, каб прадметнае асяроддзе, прыродныя і сацыякультурныя сродкі спрыялі рознабаковаму развіццю дзяцей, умацаванню іх здароўя, забяспечвалі псіхалагічны і функцыянальны камфорт, уплывалі на фарміраванне асобы ў цэлым.

Ствараючы развіваючае прадметнае асяроддзе ў дзіцячым садзе, трэба памятаць: дзіця развіваецца ў дзейнасці. Дарослыя павінны паклапаціцца аб сістэме спрыяльных умоў для своечасовага ўзнікнення, узбагачэння, развіцця розных відаў дзейнасці дзіцяці, перш за ўсё спецыфічных «дзіцячых». Педагогі прадумваюць змест і размяшчэнне асобных кампанентаў развіваючага прадметнага асяроддзя ў дзіцячым садзе, у канкрэтных яго групах, улічваючы пры гэтым не толькі «сённяшні», актуальны ўзровень развіцця выхаванцаў, а і «зону бліжэйшага развіцця». Галоўная ўвага адводзіцца разумнай арганізацыі прасторы групавога пакоя. Неабходна прадугледжваць пры планаванні месцы для дынамічных і спакойных, групавых і індывідуальных заняткаў дзяцей.

У развіваючым прадметна-прасторавым асяроддзі выдзяляюцца цэнтры (куткі) для самастойнай дзейнасці дашкольнікаў у групе (гульнявы, музычны, кніжны, эксперыментальны, будаўнічы, тэатральны, прыродазнаўчы, куток цішыні і інш.). Пры гэтым трэба пакінуць і прастору для дзіцячых гульняў. Якія куткі будуць у канкрэтнай групе — вырашае педагог сумесна са сваімі выхаванцамі, зыходзячы з іх узросту, патрэбнасцей, інтарэсаў, магчымасцей дзіцячага сада і інш. Асноўнае прызначэнне такіх цэнтраў — выклікаць цікаўнасць дзяцей да самастойных заняткаў, стымуляваць самаразвіццё, фарміраваць уменне самастойна знаходзіць занятак, выявіць дзіцячыя інтарэсы, здольнасці і спрыяць іх развіццю.

У сістэме развіваючага прадметнага асяроддзя сучаснага дзіцячага сада знаходзіцца месца і для аб'ектаў, якімі карыстаюцца дзеці розных груп пры развіцці фізічных і псіхічных магчымасцей, творчага патэнцыялу (гульнятэка, плавальны басейн, мастацкія студыі, камп'ютэрна-гульнявы комплекс, дзіцячая бібліятэка, навучальна-гульнявы комплекс для далучэння дзяцей да замежных моў і інш.).

Развіваючае прадметна-прасторавае асяроддзе прадугледжвае ўмовы і для сумеснай дзейнасці дзяцей і дарослых — бацькоў, педагогаў, іншых супрацоўнікаў дзіцячага сада (напрыклад, майстэрні па вырабе цацак, мадэліраванні і шыцці адзення, мастацкага пляцення, фларыстыкі і флорамазаікі і інш.). Ствараюцца спрыяльныя ўмовы і для працы супрацоўнікаў дашкольных устаноў. Важна, каб кампанент прадметнага асяроддзя адказваў асноўным палажэнням НАП (навуковай арганізацыі працы), спрыяў добраму настрою.

Немалое значэнне для развіваючага прадметнага асяроддзя мае памяшканне дзіцячага сада, яго афармленне.

Тыпавыя праекты будынкаў дашкольных устаноў ствараюцца архітэктарамі. Аднак навакольны архітэктурны ландшафт, асаблівасці рэльефу, аздабленне будынка (каляровае, фактурнае і інш.), азеляненне ўчасткаў надаюць дзіцячаму саду арыгінальнасць і непаўторны выгляд.

Пры афармленні памяшканняў дзіцячага сада неабходна ўлічваць узроставыя, фізічныя і псіхалагічныя асаблівасці дашкольнікаў, а таксама фактары, якія ўплываюць на інтэр'ер: санітар-

на-гігіенічны рэжым, асаблівасці архітэктурна-планіровачнага вырашэння будынка (месцазнаходжанне будынка, характэрныя асаблівасці навакольнай забудовы і прыроднага ландшафту, арыентацыя памяшканняў па баках гарызонта), спецыфіка функцыянальных працэсаў, патрабаванні тэхнікі бяспекі.

У памяшканнях дзіцячага сада дзіця павінна сустракацца з тым, што адказвае патрабаванням добрага густу і выклікае станоўчыя эмоцыі: багацце святла, разнастайнасць фарбаў, лёгкасць дэкору, сучасная дэкаратыўнасць, прастата і яркасць формы, плаўныя лініі, натуральныя матэрыялы, выразнасць сюжэтаў і фактуры, гармонія.

У афармленні памяшканняў прымяняюцца народныя традыцыі пры захаванні сучаснага выгляду дзіцячага сада. Наяўнасць прадметаў беларускага народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў памяшканнях павінна адпавядаць эстэтычным, функцыянальным і педагагічным патрабаванням. Галоўнае — стварыць у дзіцячым садзе нацыянальны каларыт. Удалае спалучэнне народнага мастацтва з тэндэнцыямі сучаснага дызайну дапамогуць педагогу далучыць дзяцей да матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі, выхоўваць пачуццё гонару за свой народ, фарміраваць эстэтычны густ.

ВАЖНЫ КАМПАНЕНТ развіваючага прадметна-прасторавага асяроддзя — прырода, ландшафт. У стварэнні ландшафтнага асяроддзя прымае ўдзел працоўны калектыў дашкольнай установы і бацькі. З дапамогай раслін (дрэвы, кусты, кветкі, травы) пляцоўкам і будынку надаецца прывабны, эстэтычны і ўтульны выгляд. Неабходна паклапаціцца аб тым, каб расліны ў памяшканні і на пляцоўцы дзіцячага сада забяспечвалі спрыяльны мікраклімат, фітатэрапеўтычны эфект; іх успрыманне — нараджала эстэтычныя пачуцці і ў дзяцей, і ў дарослых (дзякуючы наяўнасці рознакаляровай гамы адценняў і адмысловым спосабам пасадкі).

Ствараючы эстэтычнае і экалагічнае ландшафтнае асяроддзе, трэба помніць аб актыўнай, змястоўнай дзейнасці дзяцей у час прагулак. На пляцоўцы дзіцячага сада размяшчаецца адпаведнае абсталяванне для гульняў, працы ў прыродзе, рухальнай, пазнавальнай, пазнавальна-практычнай дзейнасці, а таксама для адпачынку, адасаблення дзяцей пры жаданні.

Для развіцця выхаванцаў трэба ўлічваць і навакολле за межамі дзіцячага сада, яго культурныя ландшафты (парк, сад і інш.).

Трэба імкнуцца, каб створанае сумеснымі намаганнямі прадметнае асяроддзе дашкольнай установы не толькі развівала асобу дзіцяці, а і нараджала давер да наваколля, стварала атмасферу абароненасці і дабрабыту — як у дзяцей, так і ў дарослых, якія клапоцяцца пра іх.



Ва ўмовах сучаснага экалагічнага дыскамфорту трэба вучыць дзяцей знаходзіць месцы ў прыродзе для адпачынку і гульні, дзе менш пылу, смецця, шкодных выкідаў прамысловых прадпрыемстваў і машын. Прадугледжваюцца такія куткі як на тэрыторыі дзіцячага сада, так і ў бліжэйшым мікрараёне, куды дзеці змогуць прыходзіць «за здароўем»: падыхаць чыстым паветрам, адпачыць ад спякоты і шуму, пагрэцца на сонейку, папрактыкавацца ў рухах, у спрытнасці і інш. Добра, калі дзеці самі прыдумаюць вобразныя назвы гэтым утульным куткам прыроды: «Крыніца здароўя», «Домік сонейка» (цішыні, прахалоды, птушыных галасоў), «Царства прыроды», «Наша палянка» і г.д.

Дадзім дзецям магчымасць прымаць пасільны ўдзел у стварэнні і пераўтварэнні прадметнага асяроддзя, яго ўзбагачэнні (афармленне групавога пакоя да свята, выраб атрыбутаў для гульні, дэкарацый да лялечнага паказу, пасадка кветак на ўчастку і інш.).

## Арганізацыя выхаваўча-адукацыйнага працэсу

УВАСАБЛЕННЕ ў педагагічную практыку праграмы вызначаецца арганізацыяй выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў дзіцячым садзе, яго планаваннем. Планаванне — стрыжань навуковага кіравання. Асноўная мэта планавання работы асобасна-арыентаванага выхавальніка сёння — забеспячэнне рознабаковага, гарманічнага развіцця дзіцяці, шчасця ў яго сённяшнім жыцці. Дасягненне гэтай мэты, як паказвае практыка, — працэс больш складаны і цяжкі, чым назапашванне ВУНаў (ведаў, уменняў, навыкаў).

Ажыццяўляючы планаванне, трэба кіравацца як задачамі развіцця і выхавання, так і ведамі аб узроставых і індывідуальных асаблівасцях выхаванцаў. Усю выхаваўча-адукацыйную работу з дзецьмі трэба арганізоўваць з улікам псіхалагічных асаблівасцей дзяцей канкрэтнага ўзросту. Пра гэта пісалі такія вядомыя

псіхолагі і педагогі, як К.Дз.Ушынскі, П.П.Блонскі, Л.С.Выгоцкі, В.А.Сухамлінскі і інш. Так, у сваёй першай кнізе «Введение в дошкольное воспитание», прысвечанай праблемам дашкольнага дзяцінства, П.П.Блонскі пісаў: «Выхаванне... павінна здзяйсняцца ў накірунку, які вызначаецца самой прыродай дзіцяці. Выхаванне, як штучная працэдура, з дапамогай якой спадзяюцца зрабіць дзіця тым, чым адвольна хочацца бачыць яго выхавальнікам, можа толькі знявечыць дзіця. Адзінае правільнае выхаванне — натуральны рост душэўных сіл дзіцяці, якія спалучаюцца з прыроднымі задаткамі дзіцяці». Пры планаванні трэба ўлічваць інтарэсы і патрэбнасці, здольнасці дзяцей канкрэтнай групы, з якой працуе педагог (нават у адным дзіцячым садзе яны могуць адрозніввацца), асаблівасці дзіцячага калектыву, пажаданні бацькоў, іх магчымасці пры аказанні дапамогі ў рэалізацыі сумесна задуманага.

Педагог вырашае сам, наколькі дэтальным будзе план. Многае вызначае адукацыя, педагагічны вопыт выхавальніка, індывідуальны стыль яго дзейнасці. Але ў плане нельга прадугледзець усе нюансы дынамічнага жыцця, нечаканыя, непрадбачныя з'явы прыроды, якія патрабуюць унясення карэкціровак у запланаваную дзейнасць. У аснову планавання трэба пакласці здаровы сэнс, адказнасць за дзіця, разуменне яго патрэбнасцей і запытаў.

Пры планаванні неабходна прадугледзець і шэраг стабільных кампанентаў жыццядзейнасці дзяцей: штодзённую ранішнюю гімнастыку, захаванне рэжыму (харчаванне, сон, прагулка), самастойную дзіцячую дзейнасць, стварэнне ўмоў для яе ўзбагачэння і развіцця, спецыфіку правядзення заняткаў з выхаванцамі.

Асноўны змест праграмы, сістэма прадстаўлены у ёй задач, якія звязаны з гарманічным развіццём, асноўныя яго лініі (фізічнае, асобаснае, інтэлектуальнае) плануюцца і вырашаюцца ў розных відах дзіцячай дзейнасці (гл. табл.).

| Віды дзіцячай дзейнасці | Гармонія трох пачаткаў | | |
|---|---|---|---|
| | Фізічнае развіццё | Асобаснае развіццё (духоўны пачатак) | Інтэлектуальнае развіццё |
| **Гульня**<br>Сюжэтна-ролевая, рэжысёрская<br>Гульні з правіламі: рухомыя, дыдактычныя, музычныя, камп'ютэрныя, гульні-драматызацыі, іншыя<br><br>**Мастацкая дзейнасць**<br>Музычная, выяўленчая: маляванне, лепка, аплікацыя, канструяванне; мастацка-маўленчая<br><br>**Зносіны**<br>*Сітуатыўныя:* эмацыянальна-асобасныя, дзелавыя;<br>*Пазасітуатыўныя:* пазасітуатыўна-пазнавальныя, пазасітуатыўна-асобасныя<br><br>**Пазнавальна-практычная дзейнасць**<br>(дзіцячае эксперыментаванне і інш.)<br><br>**Бытавая і працоўная дзейнасць**<br>Самаабслугоўванне, гаспадарча-бытавая, ручная праца, праца ў прыродзе.<br><br>**Вучэбная дзейнасць** | Поле выхаваўча-адукацыйных задач | | |

У кожнай групе «вага» канкрэтнага віду дзіцячай дзейнасці ў рашэнні праграмных задач будзе адрозніввацца ў залежнасці ад наяўнасці такой дзейнасці ў канкрэтным узросце, ступені яе сфарміраванасці, цікаўнасці дзяцей да яе. План педагога павінен прадугледжваць і работу, накіраваную на развіццё саміх відаў дзіцячай дзейнасці, паднясце статусу спецыфічных дзіцячых відаў дзейнасці, перш за ўсё — гульнявой (сюжэтна-ролевыя, рэжысёрскія гульні і інш.), а таксама мастацкай (музычнай, выяўленчай і інш.), дзіцячага эксперыментавання, магчымасці якіх вялікія ў дадзеным перыядзе. Дзейнасць, праектуемая педагагічным калектывам, прадугледжвае далучэнне дзяцей да музыкі (асабліва класічнай, народнай), да лепшых узораў дзіцячай літаратуры, выяўленчага мастацтва ў паўсядзённым жыцці дзяцей.

Пры планаванні работы трэба ўлічваць не толькі дзіцячую дзейнасць, якую арганізуе педагог (ранішняя гімнастыка, заняткі і інш.), але і дзейнасць дзяцей ў супрацоўніцтве і сутворчасці з дарослым, а таксама самастойную. Важнейшым крытэрыем з'яўляецца і стварэнне спрыяльных умоў для самастойнай дзейнасці дзіцяці, у якой ажыццяўляецца яго самаразвіццё, фарміруецца асэнсаванне ім сябе як суб'екта дзейнасці.

Пераважаць павінны падгрупавыя, індывідуальныя формы арганізацыі дзейнасці.

Педагог імкнецца да авалодання праграмай, яе базісным кампанентам усімі выхаванцамі. Адной з форм дасягнення гэтага з'яўляецца навучанне, якое дасягаецца ў працэсе рэгулярных заняткаў. Гэтую форму навучання педагог пачынае выкарыстоўваць з дзецьмі трэцяга года жыцця.

Пры арганізацыі іх трэба ўлічваць псіхафізіялагічныя магчымасці дзяцей, каб пазбегнуць стамлення. Агульная працягласць двух заняткаў не перавышае 30 мінут. Магчымасці дашкольнікаў дазваляюць павялічваць працягласць і колькасць заняткаў: з дзецьмі чацвёртага — пятага года жыцця (група «Чамучкі») праводзяцца дватры заняткі ў дзень (адзін — у другую палову дня) агульнай працягласцю 40 — 45 мінут; на шостым годзе жыцця (група «Фантазёры») праводзяцца два-тры заняткі ў дзень (адзін — у другую палову дня), іх працягласць узрастае — да адной гадзіны (2 заняткі), паўтары гадзіны (3 заняткі). З дзецьмі сёмага года

жыцця 3 заняткі могуць доўжыцца да 1 гадзіны 45 мінут.

**Такое размеркаванне часу прыкладнае і залежыць ад зацікаўленасці дзяцей дадзеным відам дзейнасці.**

Распрацаваная выхавальнікам сумесна з выхавальнікам-метадыстам (загадчыкам) сетка заняткаў прадугледжвае розныя іх віды (музычны, маляванне, канструяванне, развіццё мовы, фізкультурны, матэматыка і інш.), іх пэўныя суадносіны, якія мяняюцца ў залежнасці ад узросту. Педагогі дзіцячага сада вызначаюць перыядычнасць канкрэтных відаў заняткаў з улікам не толькі ўзросту выхаванцаў (**спецыяльныя** заняткі па матэматыцы і па падрыхтоўцы да авалодання граматай звычайна плануюцца са старэйшымі дашкольнікамі), а і асаблівасцей іх развіцця ў пэўнай сферы, умовах жыццядзейнасці, развіваючага асяроддзя, матэрыяльнай базы дзіцячага сада.

Формы арганізацыі навучання дзяцей на занятках розныя.

Паспяхова рэалізуецца гуманістычны падыход да дзяцей — педагог аддае перавагу **падгрупавым** заняткам (пры франтальных цяжка ажыццяўляць індывідуальны падыход, істотна зніжаецца праяўленне актыўнасці кожным выхаванцам).

*Увасабленню праграмы ў практыку спрыяюць апора на дзіцячы вопыт, шырокае прымяненне гульні (асабліва з малодшымі выхаванцамі), комплексных заняткаў (маляванне і музычны, матэматыка і аплікацыя, канструяванне і родная мова і г.д.), сюжэтных (у аснове — казачны сюжэт).*

Пры planаванні заняткаў трэба прадугледжваць насычанасць маючых адбыцца заняткаў эмоцыямі здзіўлення, сумнення, здагадкамі, радасцю адкрыцця, апору на адзінства «афекту і інтэлекту» (Л.С.Выгоцкі). Даследаванні айчынных і замежных навукоўцаў даказалі, што эфектыўнасць навучання дашкольнікаў значна павышаецца, калі скарыстаныя педагогам метады «адрасаваны» не толькі леваму паўшар'ю (адказнаму за асэнсаваныя адвольныя акты, славесна-лагічную памяць, рацыянальнае мысленне), але і праваму, якое выконвае вядучую ролю ў рэалізацыі неадвольных, інтуітыўных рэакцый, ірацыянальнай разумовай дзейнасці, вобразнай памяці.

У сувязі з гэтым у працэсе навучання мэтазгодна ўключаць



дзяцей у такія віды дзейнасці, якія разлічаны на актывізацыю абодвух паўшар'яў, а таксама неабходна ўлічваць палавую розніцу хлопчыкаў і дзяўчынак.

Веды, уменні, навыкі — значныя набыткі дзіцяці ў працэсе навучання. Педагог імкнецца, каб навучанне было выхаваўчым, развіваючым. Шырокае выкарыстанне праблемных сітуацый, эксперыментаванне спрыяе развіццю цікавасці да заняткаў, прагі да самастойнага набыцця ведаў, фарміраванню творчых здольнасцей.

Далучэнне дзяцей да індывідуальных і нацыянальных каштоўнасцей не толькі ў дзіцячым садзе, але і за яго межамі (экскурсіі да архітэктурных помнікаў, у музей народнай творчасці, выяўленчага мастацтва і інш.) таксама павінна быць прадугледжана планам.

Праектуючы работу з дашкольнікамі (асабліва са старэйшымі), трэба імкнуцца да разумнага спалучэння базіснай і датковай адукацыі, накіраванай на развіццё агульных і спецыяльных здольнасцей дзіцяці, яго асобы ў цэлым.

Праграма надае асаблівую ўвагу зносінам педагога з дзецьмі (не толькі на занятках, а і ў паўсядзённым жыцці): зносінам эмацыянальным, дзелавым, пазнавальным і асабліва — асобасным, у якіх выхавальнік глыбей пазнае сваіх выхаванцаў, і, разам з тым, раскрывае сябе, свае інтарэсы, здольнасці. Такім чынам ён становіцца яшчэ бліжэйшым і больш зразумелым для дзяцей. А гэта дапаможа зрабіць дзіцячы сад домам радасці не толькі для дзіцяці, а і для педагогаў, бацькоў.

. . .

**Гэты артыкул падрыхтаваў творчы калектыў у складзе акадэміка, доктара псіхалагічных навук Я.Л.Каламінскага; прафесара, кандыдата псіхалагічных навук Л.А.Панько; кандыдата педагагічных навук Т.М.Карасцялёвай; прафесара, кандыдата псіхалагічных навук В.А.Шышкінай; загадчыка лабараторыі дашкольнага выхавання Рэспубліканскага метадычнага цэнтра вучэбнай кнігі і сродкаў навучання Т.Б.Брацкай; кандыдата псіхалагічных навук А.Л.Гуткоўскай; дацэнта, кандыдата педагагічных навук Н.У.Ліцвінай.**